долга, требуя подчинения личных интересов и настроений общим. Несмотря на низкий уровень жизни, основные настроения жителей региона определялись оптимистическими ожиданиями.

**Заключение.** Таким образом, тяжелые социально-экономические условия послеоккупационной военной повседневности, острые проблемы в области питания и материального обеспечения отодвигали на второй план вопросы досуга, культурного проведения свободного времени. Однако, трудности жизни – неизбежные после столь разрушительной войны и трехлетней оккупации – воспринимались основной частью населения с пониманием, как своего рода «норма» послевоенного бытия. Местные органы власти уже в послеоккупационный период войны прилагали усилия по воссозданию работы учреждений культуры и образования, которым придавалось большое значение в политико-моральном воспитании населения. Вместе с тем, прежде всего развитие образования и досуговой сферы являлись не только необходимой составляющей налаживания мирной жизни в регионе, но и осознавались как изменения к лучшему самим обществом, в сферу повседневности которого начинали включаться не только материальные, но и духовные ценности.

Список литературы

1. Государственный архив Витебской области. – Ф. 119-п. – Оп. 1.
2. Государственный архив Витебской области. – Ф. 102-п. – Оп. 3.
3. Государственный архив Витебской области. – Ф. 10113-п. – Оп. 1.
4. Государственный архив Витебской области. – Ф. 1-п. – Оп. 1.
5. Государственный архив Витебской области. – Ф. 10060. – Оп. 1.

## СТАЛЫПІНСКАЯ АГРАРНАЯ І НОВАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ: АГУЛЬНАЕ І АСАБЛІВАЕ

*М.М. Пархімовіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Усяго за першую чвэрць ХХ ст. на беларускіх землях былі зроблены спробы правесці дзве аграрныя рэформы: сталыпінскую і нэп (маецца на увазе яе аграрная частка). Сталыпінскую рэформу даследавалі Л.П. Ліпінскі, В.П. Панюціч, В.М. Фамін. Новую эканамічную палітыку – М.А. Бяспалая, Р.П. Платонаў, А.М. Сарокін. Частку высноў, зробленых аўтарамі, мы падзяляем, з некаторымі – пагадзіцца не можам. Разам з тым, мы не збіраемся рабіць гістарыяграфічнага аналізу прац, прысвечаных згаданым рэформам. Наша мэта – параўнаць гэтыя аграрныя пераўтварэнні, выявіць іх агульныя рысы і паказаць разыходжанні.

**Матэрыял і метады.** Работа грунтуецца на надрукаваных дакументах, якія тычацца сталыпінская рэформы і нэпа. У рабоце выкарыстаны агульнанавуковыя метады: рух ад канкрэтнага да абстрактнага і ад абстрактнага да канкрэтнага, метад сістэмнага і дыялектычнага аналізу. Аўтар абапіраўся таксама на спецыяльныя гістарычныя метады: гісторыка-параўнаўчы, гісторыка-генетычны, гісторыка-сістэмны. Выкарыстоўваўся намі і метад гістарычнай рэтраспекцыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Аграрную рэформу пачатку ХХ ст. называць “сталыпінская” не зусім правільна. Так, адно з важнейшых палажэнняў рэформы – ліквідацыя абшчыны – мела сваім аўтарам супрацоўніка МУС Расійскай імперыі У.І. Гурко. Таму правільна будзе лічыць П.А. Сталыпіна асобай, якая здолела сабраць у адзінае цэлае чужыя і ўласныя ідэі, звесці іх у пэўную сістэму і, нягледзячы на жорсткае супраціўленне “злева” і “справа”, дабівацца рэалізацыі. Сталыпінская аграрная рэформа не склалася ў адначассе. Асноўныя яе палажэнні фарміраваліся і дапаўняліся на працягу 1906–1911 гг.

Новую эканамічную палітыку таксама неправамерна лічыць “ленінскай”. Як і П. Сталыпін, У. Ленін аб’яднаў разам уласныя ідэі і чужыя думкі. У прыватнасці, замена харчраскладкі харчпадаткам, прапанаваная У. Леніным на Х з’ездзе РКП(б), – ідэя Л. Троцкага. Апошні прапаноўваў зрабіць такі крок раней, у 1920 г. Як і сталыпінская аграрная рэформа, нэп склалася на працягу шэрагу гадоў.

Сталыпінская рэформа была адказам на выклік часу – першую расійскую рэвалюцыю. Аграрная рэформа, на думку П. Сталыпіна, павінна была ліквідаваць першапрычыну рэвалюцыі – беднасць, невуцтва, зямельныя “нестроения”, стаць фундаментам новага сацыяльна-эканамічнага сялянскага ладу і захаваць манархію ў Расіі.



Репозиторий ВГУ

Нэп таксама была рэакцыяй на надзвычайную сацыяльна-палітычную сітуацыю ў краіне. Аднак, калі рэформа П. Сталыпіна павінна была ўратаваць краіну ад рэвалюцыі, то новая эканамічная – уратаваць сацыялістычную рэвалюцыі. Новай гэту палітыку трэба называць толькі у дачыненні да папярэдняй – “ваеннага камунізму”. Па сутнасці ж нічога новага у сабе нэп не несла. Асноўны яе стрыжань – замена харчраскладкі харчпадаткам. Устанаўленне яго было вяртаннем да нармальнай практыкі узаемаадносін паміж вытворцам і дзяржавай. Такой была сусветная практыка. Такая яна і зараз. Нічога новага тут бальшавікі не вынайшлі.

Ратаваць рэвалюцыю збіраліся з дапамогай таго ж інструменту, што і П. Сталыпін: наданне свабоды селяніну ў справе ўладкавання яго лёсу і распараджэння надзельнай зямлёй. Велічыня ж “сталыпінскай” і “ленінская” свабоды была рознай. П. Сталыпін лічыў асновай свабоды прыватную уласнасць на зямлю. У. Ленін зыходзіў з дзяржаўнай уласнасці. Адсюль розная мера свабоды для селяніна. Згодна П. Сталыпіна, купля-продаж зямлі – неад’мнае права селяніна. Ва ўмовах нэпа такой магчымасці вясковыя працаўнікі не мелі.

Аграрную рэформу П. Сталыпін разглядаў як доўгатэрміновую стратэгічную лінію ўрада. У выніку яе ў вёсцы павінны былі скласціся свабодныя ад галечы, недасведчанасці і бяспраў’я, моцныя і дужыя вытворцы – асабістыя уласнікі. Не для кулакоў рабілася рэформа, а для ўсяго сялянства. Менавіта яно павінна было стаць гарантыяй міру і спакою ў дзяржаве. У цэнтры рэформы П. Сталыпіна быў селянін.

Дапускаючы развіццё прыватнай ініцыятывы У. Ленін бачыў у гэтым толькі часовы сродак, што павінен быў выратаваць сацыялістычную рэвалюцыю. Нэп разглядалася як часовае адступленне. Індывідуальная сялянская гаспадарка, як аснова аграрнага сектару, бальшавікамі не разглядалася. Для У. Леніна “моцныя” і “дужыя” былі “кулакамі”, не сумяшчальнымі з сацыялістычным ладам. Бальшавікі лічылі сялян ніжэйшай па ўзроўню свядомасці катэгорыяй насельніцтва. Яны абапіраліся на пралетарыят, а сялян лічылі носьбітамі “дробнабуржуазнай ідэалогіі”. Такі падыход быў прамой процілегласцю поглядам П. Сталыпіна.

Адной з складовых частак сталыпінскай рэформы было стварэнне хутароў. Гэта форма вядзення гаспадаркі павінна была стаць дамінуючай. Рэалізаваць гэты накірунак рэформы не ўдалося. У час нэпа, калі сялянам была дадзена свабода выбару форм землекарыстання, адной з самых папулярных форм арганізацыі гаспадаркі ў Савецкай Беларусі сталі хутары. Гэта было сведчаннем правата П. Сталыпіна. Характэрна, што камасацыя, якая праводзілася ў Заходняй Беларусі, была, па сутнасці, часткай сталыпінскай рэформы па стварэнню хутарскіх гаспадарак.

Адстойваючы прыватную ўласнасць на зямлю, П.А. Сталыпін быў супраць пазбаўлення такога права памешчыкаў і надзялення за іх кошт сялян. Адзін з яго аргументаў заключаўся ў тым, што ў губернях з урадлівай зямлёй існуе аграрная перанаселенасць. Нават калі ў гэтых губернях усю зямлю падзяліць пароўну, то яе фізічна не хопіць, каб задаволіць усіх земляробаў. Надзелы будуць мізэрнымі і арганізаваць на іх прыбытковую гаспадарку будзе немагчыма. У якасці аднаго з накірункаў выхаду з данай сітуацыі П. Сталыпін прапанаваў перасяленне сялян на свабодныя землі ў іншыя рэгіёны Расійскай імперыі.

У гады нэпа ў Савецкай Беларусі было завершана размеркаванне памешчыцкіх зямель сярод сялян. Частку зямлі сяляне атрымалі з дзяржаўнага фонду. Былі абрэзаны зямельныя ўчасткі “кулакоў” і іх таксама размеркавалі сярод сялян. Аднак карысці ад такога размеркавання было мала. Адбылося тое, аб чым папярэджваў П. Сталыпін. Сялянскія зямельныя надзелы былі невялікімі. Весці на іх высокатаварную гаспадарку было немагчыма.

П.А. Сталыпін і У.І. Ленін, нягледзячы на розны светапогляд і палітычныя прыярытэты, былі асобамі неардынарнымі для свайго часу. Абедзве рэформы займелі сілу і пачалі рэалізоўвацца дзякуючы іх намаганням. Яны ніколі не сустракаліся паміж сабою. На розныя гады выпаў час іх палітычнай дзейнасці. Верагодна, што завочна яны ўсё ж былі знаёмыя. Па роду сваёй службы П. Сталыпін павінен быў ведаць лідараў “левых” і “правых”, знаёміцца з іх поглядамі. У. Ленін не толькі добра ведаў П. Сталыпіна, але і падрабязна вывучаў і аналізаваў яго аграрную рэформу. Па нашых падліках, у 5 выданні поўнага збору ленінскіх твораў да сталыпінскай рэформы У. Ленін звяртаецца ў 14 тамах на больш чым 150 старонках. Лідар бальшавікоў станоўча ацэньваў эканамічны аспект сталыпінскай рэформы, лічыў яго прагрэсіўным, бачыў у ім адзіны правільны шлях развіцця капіталізму ў вёсцы. У цэлым, У. Ленін ацэньваў рэформу негатыўна. Тлумачыца гэта тым, што яе рэалізацыя прывяла б да стварэння ў вёсцы моцнага прыватнага ўласніка. Пасля гэтага, па словах У. Леніна, шанцаў у сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі не будзе. Тым не менш, будучы палітычным прагматыкам, У. Ленін, за-

Рэпазіторый ВДУ

быўшыся на крытыку, выкарыстаў некаторыя падыходы П. Сталыпіна да аграрнага пытання, каб выратаваць у 1921 г. уладу бальшавікоў.

Сталыпінская аграрная рэформа не была завершана. Яе мэта не была дасягнута. Галеча, невуцтва, малазямелле не былі ліквідаваны, а сяляне не сталі апорай трону. Прычыны няўдачы былі наступныя. Па-першае, П. Сталыпін страціў падтрымку Мікалая II, які стаў зайдросціць папулярнасці старшыні Савета Міністраў. Па-другое, супраціўленне рэформе аказалі памешчыкі, якія баяліся з'яўлення ў вёсцы канкурэнта ў асобе моцнага селяніна-гаспадара. Па-трэцяе, сваю ролю адыгралі "левыя" і іх агітацыя супраць рэформы. У чацвёртых, П. Сталыпін лічыў, што поспех рэформ будзе гарантаваны толькі ў тым выпадку калі ў Расіі будзе дасягнута грамадскае заспакаенне (спачатку заспакаенне, потым рэформы). Такога заспакаення дабіцца не ўдалося. П. Сталыпін марыў аб 20 гадах унутранага і знешняга спакою дзеля поспеху рэформы. Такога шанца гісторыя яму не дала. У пятых, была парушана цэласнасць сістэмы рэформы П. Сталыпіна. Асабліва гэта стала праяўляцца пасля яго смерці. Шостая прычына заключалася ў тым, што складовыя часткі рэформы патрабавалі карэкціроўкі, дапаўнення, а можа і змены. Так, наведаўшы ў 1910 г. Сібір, П. Сталыпін прыйшоў да высновы, што перасяленне не вырашае праблемы аграрнай перанаселенасці. Часу выправіць сітуацыю ў яго не хапіла.

Сталыпінская аграрная рэформа не выратавала манархію ў Расіі. Аграрная ж частка нэпа адыграла рашаючую ролю ў захаванні ўлады бальшавікоў. Калі яны пераканаліся, што пагрозы іх уладзе больш няма – нэп была згорнута.

**Заключэнне.** Такім чынам, галоўнае адрозненне паміж сталыпінскай аграрнай і нэпам заключалася ў падыходах да асобы селяніна. П. Сталыпін бачыў яго асобай паўнавартаснай, як багатага, адукаванага, валодаючага ўсім комплексам правоў гаспадара. У. Ленін разглядаў селяніна як "дробнабуржуазнага ўласніка". Для бальшавікоў селянін быў толькі інструментам ратавання рэвалюцыі. У сацыялістычнай дзяржаве не было месца індувідуальнаму і багатаму сельскагаспадарчаму вытворцу.

Як не дзіўна, але і аб'ядноўвае гэтыя рэформы асоба селяніна. Нягледзячы на розныя палітычныя ідэалы П. Сталыпіна і У. Леніна ратаваць краіну ў іх павінен быў земляроб. Праўда, гэта былі розныя краіны. "Неаднолькавы" быў і селянін.

## КОМПЛЕКСНАЯ КРАЯЗНАЎЧАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПЕРШАМАЙСКАГА РАЁНА ГОРАДА ВІЦЕБСКА ДЛЯ ПРЭЗЕНТАЦЫЙНАГА ВЫДАННЯ

*М.В. Півавар*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

У апошні час асаблівую актуальнасць атрымала стварэнне кніг, прэзентацый, рэсурсаў, сайтаў, якія змогуць годна прадстаўляць і рэкламаваць гарады і раёны краіны. Падрыхтоўка такіх выданняў звужаецца нават да працы з унутрыгарадскімі аб'ектамі і ўстановамі. Віцебск падзелены на тры раёны. Самым вялікім з'яўляецца Першамайскі. Выданне прадстаўнічага характару, якое змяшчае комплексную характарыстыку раёна, а таксама інфармацыю пра асноўныя прадпрыемствы, культурныя, сацыяльныя аб'екты раёна можа спрыяць некалькім задачам – прадстаўніцтву раёна і яго прадпрыемстваў сярод прадпрымальнікаў, замежных партнёраў, такім чынам садзейнічаць развіццю эканомікі, павелічэнню інвестыцый. Дугой задачай з'яўляецца папулярызацыя дасягненняў сацыяльна-эканамічнага развіцця сярод саміх жыхароў раёну. Распрацоўка мадэлі выдання, прысвечанага Першамайскаму раёну г. Віцебска, з'яўляецца мэтай нашага даследавання.

**Матэрыял і метады**. Матэрыялам для падрыхтоўкі сталі пісьмовыя крыніцы, прысвечаныя прадпрыемствам, установам, службам, гісторыка-культурным каштоўнасцям, якія знаходзяцца ў раёне. Праводзіліся агляд помнікаў, прадпрыемстваў, аналіз і супастаўленне найбольш яркіх і значных з іх, якія найлепшым чынам прэзентуюць Першамайскі раён у краіне і свеце. Разглядаліся аналагічныя выданні, прысвечаныя гарадам і раёнам Беларусі, Латвіі, Літвы, Расійскай Федэрацыі. Работа пабудавана на прынцыпах гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. У Першамайскім раёне Віцебска пражывае каля 180 тыс. чалавек. Гаспадарчую дзейнасць ажыццяўляюць больш 1700 юрыдычных асоб, каля 7000 індывідуальных прадпрымальнікаў, у тым ліку 28 буйных прамысловых прадпрыемстваў і 16 будаўнічых ар-

Репозиторий ВГУ